*І.А.ЧУПРАКОВА*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАВОЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ АСОБЫ Ў ПУБЛІЧНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ: ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

*Разглядаюцца асновы кампетэнтнаснага падыходу да фарміравання прававой культуры асобы ў публічнай бібліятэцы. Прадстаўлена пазіцыя аўтара на эксплікацыю вышэйназванага падыходу на арганізацыйныя, змястоўныя і метадычныя аспекты дзейнасці публічных бібліятэк па фарміраванні прававой культуры асобы на падставе створаных на іх базе публічных цэнтраў прававой інфармацыі.*

У сучасных умовах побач з неабходнасцю мець высокі ўзровень адукацыі, прафесіяналізму, камунікатыўнасці і мабільнасці патрэбна быць актыўным суб'ектам прававых стасункаў, удзельнікам прававога рэгулявання, дзейнічаць у адпаведнасці з маральнымі арыенцірамі і нормамі права. Дзяржава прызнае, што поспех далейшага развіцця грамадства залежыць ад таго, ці стане “высокая” прававая культура набыткам усіх грамадзян краіны.

Веданне права – разуменне яго патрабаванняў, дазволаў і забарон – набывае жыццёва важнае значэнне ў прававым грамадстве. У сучасных умовах, калі значна пашыраюцца магчымасці грамадзян па аўтаномнаму, самастойнаму ўдзелу ў грамадскім жыцці, канстытуцыйных і адміністратыўных праваадносінах, роля юрыдычнай граматнасці насельніцтва атрымлівае непараўнальнае з папярэднім часам значэнне [1, с.16].

Падвышэнне ролі асобы як паўнапраўнага суб'екта грамадскіх стасункаў – важкі вызначальнік беларускай мадэлі ўстойлівага сацыяльнага развіцця, аднымі з асноўных крытэрыяў эфектыўнасці якой з'яўляюцца развіццё асобы, раскрыццё творчага патэнцыялу чалавека. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2020 г. дэкларуе адзін з галоўных прынцыпаў: чалавек – мэта прагрэсу, а ўзровень чалавечага развіцця – мера сталасці грамадства, дзяржавы, сацыяльна-эканамічнай палітыкі [2].

Гарманічна развітая, творчая, “суверэнная”, самастойная ў вядомых межах у адносінах да дзяржавы асоба ўяўляецца перш за ўсё як юрыдычна адукаваная асоба, якая ведае свае правы і абавязкі, арыентуецца ў разнастайнасці юрыдычных з'яў, здольная знаходзіць законныя, гуманныя спосабы вырашэння жыццёвых калізій.

Адпаведна асноўным прыярытэтам развіцця беларускага грамадства мэты, задачы, прынцыпы і кірункі дзейнасці публічнай бібліятэкі (ПБ) як грамадскага інстытута, прызначанага забяспечваць узнаўленне і развіццё чалавечага капіталу, абумоўлены гуманістычнай парадыгмай. Яна акцэнтуе ўвагу на духоўна-маральнай культуры асобы, яе самаразвіцці, самаўдасканаленні, раскрыцці ўнутранага патэнцыялу і яго актывізацыі, стымуляванні творчага пачатку асобы, заахвочванні аналітычных, канструктыўна-крытычных адносін да рэчаіснасці.

Вызначэнне гэтай дамінанты як сэнсаўтваральнага фактару дзейнасці стымулюе актыўнасць публічных бібліятэк, прызнаных даследчыкамі самымі ўстойлівымі і дэмакратычнымі інфармацыйнымі ўстановамі на сучасным этапе. Гуманістычны падмурак актыўнасці ПБ праяўляецца ў яе сацыяльна-педагагічнай дзейнасці, мэтай якой з'яўляецца стварэнне ўмоў для паўнавартаснага самаразвіцця, пазітыўнай сацыялізацыі, прафесійнага станаўлення і жыццёвага самавызначэння асобы ў бягучым сацыякультурным асяроддзі. Такая адметнасць прымушае нас пагадзіцца з тым, што асновай дзейнасці сучаснай ПБ становіцца стварэнне гарманічнага адаптацыйнага асяроддзя, што садзейнічае паспяховай сацыялізацыі асобы і яе самарэалізацыі, развіццю ўстойлівых сацыяльных інтарэсаў і намераў, актыўнай жыццёвай пазіцыі, творчага патэнцыялу і крытычнага мыслення, талерантнасці.

Спецыфіка цяперашняга тысячагоддзя заключаецца ў тым, што хуткае абнаўленне ўмоў жыцця ўскладняе задачу фарміравання каштоўнасцей, адпаведных патрабаванням нестандартнай сітуацыі, пераемных у адносінах да каштоўнасцей традыцыйных. Безумоўна, у сучасных умовах аб'ектыўна ўскладняюцца і пашыраюцца патрабаванні, якія прад'яўляюцца да яго суб'ектаў: гэта і ўменне рабіць асэнсаваны выбар у сітуацыі нявыз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

начанасці, несці адказнасць за свае ўчынкі і адэкватна ацэньваць учынкі іншых, адаптавацца ва ўмовах сацыяльных пераўтварэнняў, арыентавацца ў коле сацыяльных стасункаў і знаходзіць кампраміснае вырашэнне праблем, карыстаючыся агульнапрынятымі каштоўнасцямі чалавечай супольнасці, у прыватнасці маральнымі арыенцірамі і прававымі нормамі.

Заканамерна, што на першы план выносяцца прызнанне дзяржавай неабходнасці запаўнення дэфіцыту сацыяльна-прававой кампетэнтнасці і адказнасці асобы, рэалізацыя канстытуцыйнага права грамадзян на інфармацыю, стварэнне спрыяльных умоў для прававой аховы асобы, яе самарэалізацыі і адаптацыі ў інфармацыйным грамадстве праз павышэнне прававой інфармаванасці.

Фарміраванне прававой культуры асобы і грамадства ў цэлым у сучасных умовах пазіцыянуецца як значная і адна з прыярытэтных сацыяльных праблем, да якой прыцягваецца ўвага як педагагічнай і юрыдычнай навук, так і сацыялогіі, філасофіі. З пазіцыі пэўнай галіны навуковае абгрунтаванне атрымліваюць асаблівасці, умовы, працэсы, фактары і псіхолага-педагагічныя аспекты фарміравання прававой культуры асобы і грамадства (А.П.Белікава, В.В.Грынкевіч, А.А.Зорчанка, А.А.Лукашава, Н.В.Маджына, Г.І.Мальцаў, П.А.Мусінаў, В.С.Нерсесянц, Г.І.Паддубская, Т.А.Парафіяновіч, А.В.Пячынская, І.А.Царык, Н.М.Юрашэвіч і інш.). Як новы кірунак у сучаснай педагогіцы ўзнікла педагогіка права, фарміруецца і развіваецца юрыдычная педагогіка як навуковая вобласць, у навуковы абарот уводзіцца паняцце правакультурнай асобы і распрацоўваецца яе нарматыўная мадэль, вылучаюцца ўзроўні сфарміраванасці прававой культуры асобы, што сведчыць пра шматаспектнасць навуковых пошукаў у тэарэтычнай і практычнай плоскасці акрэсленай праблемы на сучасным этапе.

У апошні час даследчыкі аналізуюць праблему фарміравання прававой культуры з пазіцыі кампетэнтнаснага падыходу, што знайшло адлюстраванне ў працах І.А.Дзямідавай, А.Т.Зямновай, Л.М.Мацвіенка, С.А.Хасанавай, А.А.Чарамсіной і інш.

Бібліятэказнаўства ў межах вызначанага праблемнага поля акцэнтуе ўвагу на раскрыцці тэарэтычных і практычных пытанняў фарміравання прававой культуры асобы бібліятэчна-бібліяграфічнымі сродкамі на падставе асобасна арыентаванага падыходу, які выступае метадалагічным падмуркам сацыяльна-педагагічнай актыўнасці бібліятэкі ў гэтым кірунку. Мэтазгодна ў нашым даследаванні таксама выкарыстаць ідэі кампетэнтнаснага падыходу, які адлюстроўвае сучасныя тэндэнцыі гарманізацыі адукацыйных працэсаў у грамадстве і накіраваны на атрыманне асобай базавых навыкаў, што забяспечваюць ёй сацыяльную адаптацыю.

Адпавядаючы асноўным тэндэнцыям мадэрнізацыі грамадства, кампетэнтнасны падыход, на думку доктара педагагічных навук Я.А.Ямбурга, скіраваны на вырашэнне вострых сацыяльна-эканамічных праблем, што характарызуе яго як прагматычна арыентаваны ў адрозненне ад інфармацыйна-кагнітыўнай і асобаснай парадыгмаў у сучаснай педагагічнай рэальнасці [3]. Вынікам рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу з’яўляецца набор заяўленых грамадствам ключавых кампетэнцый, без якіх немагчыма дзейнасць сучаснага чалавека ў інтэлектуальным, грамадска-палітычным, камунікатыўным, інфармацыйным асяроддзі. Кампетэнтнасная парадыгма накіравана на ўмацаванне практычнай арыентацыі і інструментальнай скіраванасці адукацыі, яна імкнецца атрымаць чалавека ўмелага і мабільнага, які валодае не проста наборам ведаў, уменняў і навыкаў, а спосабамі і тэхналогіямі іх атрымання.

Бібліятэка як інстытут сацыялізацыі забяспечвае ўсім членам грамадства ўмовы для паспяховай адаптацыі праз прадастаўленне інфармацыі, стварэнне камфортных умоў для яе атрымання і вывучэння. Рэалізацыя бібліятэкай інфармацыйнай, асветніцкай, адукацыйнай, выхаваўчай і іншых функцый, культуратворчая дзейнасць у русле гуманістычных традыцый надаюць ёй параметры суб’екта фарміравання сацыяльнай кампетэнтнасці асобы ў сферы грамадзянскіх стасункаў.

У мэтах нашага даследавання актуальнай падаецца ідэя навуковага абгрунтавання працэсу фарміравання прававой кампетэнтнасці асобы ў інфармацыйным і псіхолага-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічным асяроддзі[1] публічнай бібліятэкі, на базе якой дзейнічае публічны цэнтр прававой інфармацыі (далей – ПЦПІ), пры ўмове рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу ПБ у гэтым кірунку.

З пазіцыі кампетэнтнаснага падыходу прававая культура разумеецца намі як якасць, мера і спосаб авалодання асобай агульначалавечымі і прававымі каштоўнасцямі, якія праяўляюцца ў прававой кампетэнцыі, неабходнай для паўнавартаснай сацыяльнай актыўнасці, і ўключае правамерную дзейнасць, у аснове якой знаходзяцца прававыя веды, перакананні і пазітыўныя прававыя ўстаноўкі.

На думку А.Т.Зямновай, прававая кампетэнцыя разглядаецца як сукупнасць узаемазвязаных прававых ведаў, уменняў, навыкаў, правамерных арыентацый, неабходных для ажыццяўлення асабасна і сацыяльна значнай дзейнасці [4, с.4]. Як актуальнае праяўленне кампетэнцыі і разам з тым мінімальны вопыт яе прымянення прававая кампетэнтнасць разумеецца як авалоданне сукупнасцю прававых ведаў, уменняў, навыкаў, якія дазваляюць паспяхова рэалізоўваць грамадзянскія абавязкі, асабістыя і грамадзянскія правы, праяўляць сацыяльную актыўнасць і ладзіць стасункі на аснове маральных арыенціраў і нормаў права.

Фарміраванне прававой кампетэнтнасці асобы ў публічнай бібліятэцы разглядаецца намі не з пазіцыі прафесійнай падрыхтоўкі да рэалізацыі права, а ў сувязі з неабходнасцю авалодання асобай дастатковым аб'ёмам прававых ведаў, пазітыўных каштоўнасных арыентацый і набыцця вопыту прымянення іх на практыцы. Прававая кампетэнтнасць як інтэгратыўная якасць асобы з вялікім патэнцыялам для самаразвіцця і самаўдасканалення выступае асновай станаўлення актыўнай грамадзянскай пазіцыі законапаслухмянага члена грамадства, залогам паспяховай сацыяльнай адаптацыі ў дынамічным сацыяполікультурным асяроддзі.

З улікам даследаванняў (А.А.Грышына, Л.М.Мацвіенка, Ю.А.Ціхаміраў, С.А.Хасанава, М.А.Чашанаў і інш.) у структуры прававой кампетэнтнасці асобы вылучаюцца кагнітыўны (веды), каштоўнасна-матывацыйны (перакананні, каштоўнасці, матывы) і дзейсны (вопыт) кампаненты.

Веданне гэтых кампанентаў дазваляе вылучыць і актывізаваць у дзейнасці бібліятэкі ўзаемазвязаныя комплексы або блокі па рэалізацыі кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейснага кампанентаў, што садзейнічае эфектыўнасці правасацыялізуючай дзейнасці, падкрэслівае і ўмацоўвае яе сацыяльна-педагагічныя аспекты.

Сацыяльна-педагагічны патэнцыял публічнай бібліятэкі як суб'екта фарміравання прававой культуры асобы ў нашым даследаванні разумеецца як сукупнасць магчымасцей зместу, формаў, метадаў, спосабаў педагагічнага ўздзеяння ва ўмовах бібліятэчна-інфармацыйнага асяроддзя, накіраваных на фарміраванне прававой кампетэнтнасці як складанага асобаснага ўтварэння, у якім у адзінстве праяўляюцца веды, каштоўнасці, асобасныя ўстаноўкі, навыкі і спосабы паводзін.

Лагічным у працяг нашых разважанняў падаецца раскрыццё вышэйназваных комплексаў, якія складаюць структуру дзейнасці публічнай бібліятэкі па фарміраванні кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейснага кампанентаў прававой кампетэнтнасці асобы. Мяркуем, што вылучэнне наступных комплексаў у якасці выяўных самастойных складальнікаў падаецца магчымым у выніку аналізу дзейнасці цэнтраў прававой інфармацыі, створаных на базе публічных бібліятэк.

*Інфармацыйна арыентаваны комплекс* забяспечвае матэрыяльную аснову, базіс працэсу прававой сацыялізацыі, зместам якога з'яўляюцца пазітыўныя прававыя арыентацыі, вобразы права і прадстаўленні аб ім, прававыя веды, юрыдычныя тэхналогіі.

[1] Разумеецца намі як спрыяльнае для самаразвіцця і самаўдасканалення асобы асяроддзе, створанае ў выніку актывізацыі псіхолага-педагагічных аспектаў бібліятэчнага абслугоўвання. Галоўнай характарыстыкай псіхолага-педагагічнага асяроддзя з'яўляецца псіхатэрапеўтычная аснова, пад якой разумеюцца фарміраванне і развіццё прынцыпова новых, псіхалагічна камфортных, сітуацыйна адэкватных, бяспечных для чалавека і грамадства спосабаў узаемадзеяння ў працэсе бібліятэчнага абслугоўвання. Пазіцыянуецца як сістэма ўмоў, уздзеянняў, магчымасцей для самаразвіцця асобы, сканцэнтраваных у бібліятэцы, на падставе асобасна арыентаваных тэхналогій у русле гуманістычнай скіраванасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Комплекс арыентаваны на вырашэнне інфармацыйна-пазнавальных задач і накіраваны на прадастаўленне карыстальнікам прававой інфармацыі, фарміраванне і паглыбленне прававых ведаў, у тым ліку ведаў аб значэнні, асноўных сферах і механізмах прававога рэгулявання грамадскага жыцця; аб правах і абавязках дзяржавы і грамадзян у адносінах адзін да аднаго; ведаў аб сістэме права і г.д.

Гэты комплекс забяспечваецца інфармацыйна-рэсурснай базай ПЦПІ: фарміраваннем і выкарыстаннем унутранага нонэлектроннага і электроннага дакументнага рэсурсу прававой тэматыкі, выкарыстаннем знешніх рэсурсаў (адпаведнага фонду іншых бібліятэк, рэсурсаў Інтэрнэт), аказаннем кансультацыйна-навігацыйных паслуг. Інфармацыйны комплекс уключае даведачна-бібліяграфічны апарат – сукупнасць даведачных і бібліяграфічных выданняў, неабходных для ажыццяўлення бібліяграфічнай дзейнасці, каталогі і картатэкі па праву (традыцыйная і электронная формы), базы даных прававой інфармацыі, у тым ліку рэгіянальнага характару, фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў, уласную бібліяграфічную прадукцыю для задавальнення інфармацыйна-прававых запытаў карыстальнікаў, “Архіў выкананых даведак”.

*Матывацыйна стымулюючы комплекс* накіраваны на вырашэнне каштоўнасна-матывацыйных задач і забяспечвае працэс фарміравання каштоўнасных арыентацый, установак і станоўчай матывацыі законапаслухмянай дзейнасці чалавека. Каштоўнасна-прававыя ўстаноўкі асобы – гэта глыбокае асэнсаванне індывідам каштоўнасці права, у выніку чаго ажыццяўляецца выбар правамерных паводзін. Матывацыйна стымулюючы комплекс базіруецца на канцэнтрацыі намаганняў бібліятэкараў на працэсе фарміравання ўнутранай патрэбнасці чалавека ў правамерных паводзінах, заснаванай на каштоўнасным успрыняцці права.

Рэалізацыя вышэйназванага блока забяспечваецца псіхолага-педагагічнай дзейнасцю бібліятэкі, яе інтэлектуальнымі рэсурсамі (тэарэтычнымі і метадычнымі распрацоўкамі, прафесійнай інфармацыйнай і прававой культурай бібліятэкараў). Немалаважнае значэнне мае змястоўны аспект інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў прававой інфармацыі, што звязана з вызначэннем адпаведнай мэты і тэматыкі мерапрыемстваў, выбарам бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг, формаў, метадаў і сродкаў задавальнення інфармацыйна-прававых патрэбнасцей. Падвышэнню цікавасці да права, стымуляванню матывацыі да азнаямлення з механізмамі рэалізацыі сваіх правоў і абавязкаў, да прававога вырашэння жыццёвых праблем садзейнічаюць пастаянныя і часовыя выставы прававой літаратуры, правядзенне дзён і гадзін прававой інфармацыі, “круглых сталоў”, трэнінг-курсаў, іншых мерапрыемстваў. Значным фактарам у далучэнні насельніцтва да азнаямлення з нормамі канстытуцыйнага, працоўнага, грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага, адміністратыўнага права і практыкай іх прымянення, у стымуляванні попыту на прававую інфармацыю выступаюць адпаведнае ўнутранае афармленне бібліятэкі (стэнды, выставы, пуцевадзіцелі і інш.) і знешняя рэклама прадуктаў і паслуг ПЦПІ.

Актывізацыя матывацыйна-ацэначнага комплексу стымулюе фарміраванне індывідуальных адносін да праяўленняў прававой рэчаіснасці, нормаў права, дазваляе асобе ацэньваць свае і чужыя паводзіны, учынкі і іх наступствы з пазіцыі права. Вынікам гэтай дзейнасці становіцца замацаванне ў свядомасці асобы поглядаў і перакананняў, якія забяспечваюць паважлівае стаўленне да права як рэгулятара грамадскіх адносін, а значыць – адбываецца фарміраванне каштоўнасна-матывацыйнага кампанента прававой кампетэнтнасці асобы.

Звышзадачай матывацыйна-ацэначнага комплексу з’яўляецца фарміраванне культуры актыўных, асэнсаваных адносін асобы да працэсу ўдасканалення ўласнай сістэмы каштоўнасцей (самарэфлексія). У працэсе рэалізацыі гэтага блока дасягаецца высокая матывацыя ўдзельнікаў суб’ект-суб’ектных адносін да далейшага самаразвіцця і самаўдасканалення, перагляду іерархіі ўласнай сістэмы каштоўнасцей, вызначэння месца прававых каштоўнасцей у гэтай іерархіі з мэтай яе магчымай карэкцыі для гарманізацыі адносін у сістэме Асоба – Грамадства.

*Дзейсна-практычны комплекс* накіраваны на вырашэнне праксікалагічных задач, што азначае стварэнне ўмоў для працэсуальнай падрыхтаванасці асобы ажыццяўляць дзейнасць у сферах, што рэгулююцца правам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перш за ўсё гэты блок базіруецца на змесце і форме прававых адносін асобы і бібліятэкі, якія зафіксаваны ў пэўных дакументах і ўключаны ў прававое поле бібліятэчнай установы. На лакальным узроўні легітымны характар узаемаадносін бібліятэкі і карыстальнікаў забяспечваюць “Правілы карыстання бібліятэкай”.

Карыстальнік бібліятэкі перш за ўсё знаёміцца, усведамляе змест і сутнасць прававых нормаў і правілаў, якія вызначаюць аснову стасункаў бібліятэкі і чытача, рэгулююць адносіны ў працэсе бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання. Такім чынам, сам працэс знаходжання ў бібліятэцы, стасункі з бібліятэкарамі, карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі заснаваны на абавязковых для ўсіх і для кожнага рэгламентаваных правілах.

У працэсе інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання ўзнікае цэлы шэраг грамадскіх адносін, якія падлягаюць прававому рэгуляванню. Сярод іх вылучаюцца адносіны наконт забеспячэння канстытуцыйнага права грамадзян на пошук і атрыманне інфармацыі; наконт выканання нормаў аўтарскага права ў працэсе прадастаўлення інфармацыйных паслуг; наконт забеспячэння бібліятэкай належнай якасці прадуктаў і паслуг.

У больш шырокім значэнні дзейсна-практычны комплекс актывізуецца праз стварэнне ўмоў для ўключэння карыстальнікаў прававой інфармацыі ў сацыяльную практыку, дзе яны змогуць прымяніць свае веды і ўменні, выпрацаваць навыкі прымянення прававых ведаў у сваіх штодзённых справах. У выніку асоба набывае вопыт правапаслухмянай дзейнасці, адбываецца развіццё ўменняў вылучаць прававыя аспекты ўзнікаючых жыццёвых сітуацый і вызначаць мэтазгоднасць іх вырашэння прававымі спосабамі, а таксама развіццё ўменняў бачыць прававыя наступствы прымаемых рашэнняў.

Рэалізацыя дзейсна-практычнага комплексу адбываецца пры стварэнні сітуацый, максімальна набліжаных да рэальнай практычнай дзейнасці прававога характару з мэтай набыцця асобай вопыту правамерных і сацыяльна актыўных паводзін. Стымуляванне актыўнасці асобы пры правядзенні комплексных мерапрыемстваў прававой тэматыкі на базе бібліятэкі, рэалізацыі праектаў і праграм з удзелам прадстаўнікоў мясцовых органаў кіравання, праваахоўных органаў, службаў сацыяльнай абароны насельніцтва, педагогаў і псіхолагаў, юрыстаў Рэспубліканскай калегіі адвакатаў спрыяе фарміраванню дзейснага кампанента прававой кампетэнтнасці асобы. Традыцыйнымі на базе ПЦПІ сталі школы прававых ведаў, прававыя клубы, школы маладых правазнаўцаў, цэнтры прававой культуры моладзі, маладзёжныя цэнтры прававой інфармацыі, цэнтры маладзёжных ініцыятыў, дзіцячыя цэнтры прававой інфармацыі, прававыя факультатывы, аматарскія прававыя аб’яднанні, прававыя дыскусійныя клубы, прававыя лекторыі і інш.

Інавацыйным крокам бібліятэчнай работы ў гэтым кірунку, напрыклад, з падлеткавай аўдыторыяй з’яўляецца выкарыстанне інтэрактыўных формаў па стымуляванні інтарэсу да прававых ведаў, фарміраванні попыту на прававую інфармацыю, у прыватнасці гульнямадэляванне (выкарыстанне бліц-гульняў, сюжэтна-ролевых, дыдактычных, дзелавых, арганізацыйна мыслячых і арганізацыйна-дзейсных гульняў), работа маладзёжнага парламента, грамадскай прыёмнай, падлеткавага прававога савета, іншыя формы работы на базе ПЦПІ.

Такім чынам, публічныя бібліятэкі бяруць актыўны ўдзел у працэсе вырашэння сістэмных задач павышэння прававой культуры насельніцтва. Канкрэтызацыя гэтай мэты адбываецца праз фарміраванне прававой кампетэнтнасці асобы як актуальнай асобаснай характарыстыкі, якая забяспечвае магчымасць рашэння актуальных задач у сферы стасункаў, што рэгулююцца правам.

Як суб’ект фарміравання прававой культуры насельніцтва публічная бібліятэка выконвае сацыяльны заказ грамадства на фарміраванне асобы з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, сфарміраванай інфармацыйнай і прававой культурай, развітымі якасцямі ў вобласці грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнага партнёрства, з навыкамі сацыяльна арыентаванага ўчынка. Дзейнасць цэнтраў прававой інфармацыі на базе публічных бібліятэк краіны садзейнічае фарміраванню гэтых базавых асноў, якія забяспечваюць далейшае сацыяльна-пазітыўнае развіццё асобы на аснове агульнапрынятых каштоўнасцей і прававых нормаў.

Адзначым, што публічная бібліятэка ў гэтым кантэксце выступае ініцыятарам руху сацыяльнага партнёрства на рэгіянальным узроўні, што вызначае яе як сістэмаўтваральны элемент працэсу павышэння прававой культуры мясцовага насельніцтва. Тым самым яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзельнічае ў вырашэнні праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна ва ўзаемадзеянні з органамі ўлады, бізнесам і грамадскасцю. Гэта дазваляе ў далейшым аператыўна рэагаваць на пажаданні мясцовай супольнасці, надаваць дзейнасці па фарміраванні прававой культуры насельніцтва мэтанакіраваны і комплексны характар.

---


1. *Синюкова, Т.В.* Правовая культура: понятие, структура, соотношение национального и общечеловеческого / Т.В.Синюкова // Правовая культура. – 2009. – № 2 (7). – С. 6–17.

2. *Национальная* стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Национальная комиссия по устойчивому развитию Респ. Беларусь; редкол.: Я.М.Александрович [и др.]. – Минск: Юнипак, 2004. – 200 с.

3. *Ямбург, Е.А.* Гармонизация педагогических парадигм – стратегия развития образования / Е.А.Ямбург; Моск. гор. психол.-педагог. ун-т // Официальный сайт Моск. гор. психол.-педагог. ун-та [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: //www.mgppu.ru/ru/practice/conf/doc. php?d=159.

4. *Земнова, Е.Т.* Формирование правовой компетентности учащихся при изучении курса “Человек. Общество. Государство”: учеб.-метод. пособие / Е.Т.Земнова. – Минск: БГПУ, 2005. – 80 с.



*I.CHUPRAKOVA*


## THE FORMATION OF LEGAL PERSONALITY’S COMPETENCY IN A PUBLIC LIBRARY: THE THEORETICAL ASPECT


In modern conditions a public library as an institute of a socio-cultural succession is assigned to guarantee the revival, and develop human’s capital by force of creation of conditions for rigorous personality development, positive specialization, professional formation and vital self-determination of a person in a current socio-cultural environment.

The increase of the legal population’s culture is viewed as one of the priority directions of a public library activity under the condition of realization of its informational and socio-pedagogical potential, subject to the harmonization of the approaches to the personality’s legal culture formation.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ